# ПАЛІТЫЧНАЯ РЭЗАЛЮЦЫЯ ДЭМАКРАТЫЧНЫХ СІЛ БЕЛАРУСІ

**да Канферэнцыі «Новая Беларусь» 2026**

8–9 жніўня, Варшава

**Мы, прадстаўнікі і прадстаўніцы Дэмакратычных сіл Беларусі**,

- Канстатуючы, што тэрыторыя, паветраная прастора і дзяржаўная інфраструктура Беларусі ўжо выкарыстоўваюцца Расійскай Федэрацыяй у вайне супраць Украіны, а таксама расце небяспека непасрэднага ўцягвання беларускіх войскаў у баявыя дзеянні;
- Прымаючы да ўвагі, што разам з пагрозай уцягвання Беларусі ў вайну расце пагроза незалежнасці Беларусі з боку Расіі, якая лічыць Беларусь падкантрольнай сабе тэрыторыяй;
- Зыходзячы з таго, што падтрымка расійскай агрэсіі рэжымам Лукашэнкі супярэчыць нацыянальным інтарэсам Беларусі, а беларускае грамадства катэгарычна выступае супраць вайны;
- Адзначаючы, што беларускае грамадства пазбаўлена рэальнага права выбару, а дзяржаўная ўлада выкарыстоўваецца дзеля чужых для беларускага народа інтарэсаў;
- Разумеючы, што глыбокі палітычны крызіс у Беларусі, які выкліканы нелегітымнасцю кіруючага рэжыму, перарастае ў пагрозу страты дзяржаўнасці Беларусі,

**Заяўляем наступнае**:

- Мы дзейнічаем разам дзеля дасягнення супольных мэтаў захавання незалежнасці Беларусі і вяртання нашым грамадзянам і грамадзянкам права выбару, каб дзяржава ў Беларусі служыла людзям і дзейнічала ў адпаведнасці з нацыянальнымі інтарэсамі;
- Катэгарычна асуджаем расійскую агрэсію супраць Украіны і выказваем падтрымку ўкраінскаму народу ў яго справядлівай барацьбе за сваю свабоду;
- Заклікаем грамадзян Беларусі, дзяржаўных службоўцаў, вайскоўцаў і супрацоўнікаў сілавых структур не ўдзельнічаць у расійскай агрэсіі, у палітычных рэпрэсіях, не выконваць злачынных загадаў, а таксама спрыяць захаванню суверэнітэту і бяспекі Беларусі;
- Выказваем удзячнасць кіраўніцтву ЗША за намаганні па вызваленні палітычных зняволеных у Беларусі;
- Выказваем удзячнасць міжнародным партнёрам, дзяржавам Еўрапейскага Саюза, Злучаным Штатам Амерыкі, Вялікабрытаніі, Канадзе, Нарвегіі і іншым краінам, Радзе Еўропы, ААН, АБСЕ і іншым міжнародным арганізацыям, за спрыянне вызваленню палітычных зняволеных і падтрымку барацьбы беларускага грамадства за незалежнасць сваёй краіны і дэмакратыю;

Мы заяўляем, што выхад Беларусі з палітычнага і дзяржаўнага крызісу патрабуе спынення рэпрэсій, вызвалення і рэабілітацыі палітычных зняволеных, аднаўлення суверэннага волевыяўлення беларускага народа, правядзення свабодных і справядлівых выбараў, а таксама ліквідацыі палітычнай і вайсковай залежнасці Беларусі ад Расійскай Федэрацыі.

**Найбольш надзейным і прагматычным шляхам выхаду Беларусі з палітычнага крызісу з'яўляецца агульнанацыянальны дыялог у фармаце Круглага стала з удзелам прадстаўнікоў Дэмакратычных сіл і прадстаўнікоў рэжыму, вынікам якога павінна стаць пераадоленне палітычнага канфлікту, вяртанне людзям сапраўднага права выбару і вяртанне даверу народа да ўлады, каб Беларусь стала паспяховай краінай з устойлівай дэмакратыяй і надзейнай часткай новай сістэмы бяспекі ў Еўропе.**

Жыве Беларусь!

*Офіс Святланы Ціханоўскай,*
*Аб'яднаны Пераходны Кабінет,*
*Каардынацыйная Рада,*
*Платформа палітычных партый*